ПАСТАНОВА МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
24 лістапада 2022 г. № 105

# Аб змяненні пастаноў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

На падставе пункта 1 артыкула 100, часткі пятай пункта 5 артыкула 104, часткі першай пункта 1 артыкула 121 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, падпункта 5.5 пункта 5 Палажэння аб Міністэрстве культуры, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 17 студзеня 2017 г. № 40, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Унесці змяненні ў наступныя пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь:

1.1. у пастанове Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2016 г. № 89 «Аб устанаўленні форм пашпарта матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці і ахоўнай дошкі і прызнанні страціўшымі сілу некаторых пастаноў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь»:

з назвы словы «і прызнанні страціўшымі сілу некаторых пастаноў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь» выключыць;

у дадатку 1 да гэтай пастановы:

у пункце 11 словы «і (або) дакументальных» замяніць словамі «, дакументальных, архітэктурных і (або) канструктыўных»;

з назвы графы «Дата і нумар заключэння аб адпаведнасці прымаемай у эксплуатацыю нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ на матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцях распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ» пункта 16 словы «распрацоўкай навукова-праектнай дакументацыі на выкананне рамонтна-рэстаўрацыйных работ» выключыць;

дадатак 2 да гэтай пастановы выкласці ў новай рэдакцыі (дадаецца);

1.2. у пастанове Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2016 г. № 90 «Аб устанаўленні формы ахоўнага абавязацельства»:

прэамбулу пасля слоў «На падставе» дапоўніць словамі «часткі першай»;

у дадатку да гэтай пастановы:

у пункце 1 словы «Матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць» замяніць словамі «Матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць, частка матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці»;

у пункце 9:

дапоўніць пункт падпунктам $9.1^1$ наступнага зместу:

«$9.1.^1$ пры ажыццяўленні дзейнасці на нерухомых гісторыка-культурных каштоўнасцях (у тым ліку пры выкананні рамонтна-рэстаўрацыйных і (або) іншых работ), якая можа аказваць уздзеянне на нерухомыя гісторыка-культурныя каштоўнасці, не дапускаецца змяненне гэтых гісторыка-культурных каштоўнасцей, за выключэннем навукова абгрунтаванага змянення;»;

абзац шосты падпункта 9.2 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«перадаваць гісторыка-культурную каштоўнасць у валоданне і (або) карыстанне Узброеным Сілам Рэспублікі Беларусь, іншым войскам і воінскім фарміраванням, за выключэннем гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія знаходзіліся ў іх карыстанні да 3 лютага 2017 г.;».

2. Дадзеная пастанова ўступае ў сілу з 1 студзеня 2023 г.

**Міністр** **А.М.Маркевіч**

УЗГОДНЕНА
Брэсцкі абласны
выканаўчы камітэт

Віцебскі абласны
выканаўчы камітэт

Гомельскі абласны
выканаўчы камітэт

Гродзенскі абласны
выканаўчы камітэт

Магілёўскі абласны
выканаўчы камітэт

Мінскі абласны
выканаўчы камітэт

Мінскі гарадскі
выканаўчы камітэт

Дадатак 2
да пастановы
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
28.12.2016 № 89
(у рэдакцыі пастановы
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
24.11.2022 № 105)

Форма

**АХОЎНАЯ ДОШКА***




* Ахоўная дошка, якая ўстанаўліваецца на нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці, можа выконвацца як малюнак або як барэльеф з профілем па сячэнні А–А1.